ПАМЯЦЬ

# Сустрэча на Салаўёвай пераправе

**Традыцыйная сустрэча моладзі трох краін – Беларусі, Расіі і Латвіі – адбылася напрыканцы ліпеня на маляўнічым беразе Дняпра на Смаленшчыне. Міжнародны моладзевы турыстычны фестываль «Салаўёва пераправа» вылучаецца з шэрагу тыповых мерапрыемстваў. Яго візітнай карткай з'яўляецца рэканструцыя баёў 41-га года савецкіх войскаў з нямецкімі захопнікамі за аднайменную пераправу. Удзельнікі клуба ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Памяць» на фестываль патрапілі ўжо ў трэці раз. А вось мне так пашчасціла ўпершыню.**

Гамельчане не ставяць адзіную мэту – паўдзельнічаць у рэканструцыі баёў Вялікай Айчыннай вайны, галоўнае для іх – гэта ўшанаванне памяці нашага знакамітага земляка Аляксандра Лізюкова, які ў 1941 годзе з'яўляўся каштэлянам Салаўёвай пераправы. Аднак рызыкаваў жыццём генерал у тыя жудасныя часы не адзін са сваёй сям'і, побач з ім за Радзіму змагаўся і шаснаццацігадовы сын Юрый, а на іншых франтах ваявалі яго родныя браты – Яўген і Пётр. Усе тры браты загінулі на вайне.

У невялікай вёсачцы Салаўёва сёння адна з вуліц носіць імя генерала Аляксандра Лізюкова. Шмат беларус зрабіў для перамогі і падтрымкі жыцця дзвюх армій – 16-й і 20-й у тыя жудасныя два месяцы ліпеня-жніўня, што існавала пераправа, аднак сёння ў тых мясцінах звестак пра яго жыццё і слаўныя подзвігі знойдзеш няшмат. У музеі-экспазіцыі «Салаўёва пераправа» наведвальнікі могуць убачыць толькі партрэт генерала і некалькі радкоў пра яго дзейнасць у якасці каштэляна пераправы.

Праграма фестывалю заўсёды насычаная і запамінальная. Візітоўкі каманд і конкурс патрыятычнай песні збіралі аматараў каля сцэны на беразе Дняпра. Шчыра сустракалі госці і гурт «СССР», нашых землякоў, якія з непрыхаванымі перажываннямі спявалі пра Афганістан, пра волю і цану нашага жыцця.

Традыцыйна ў Кардымаўскім муніцыпальным утварэнні (Смаленская вобласць) перад пачаткам фестывалю праходзіць вахта памяці. На месцах, дзе пашукавікі ўзнялі з зямлі рэшткі салдатаў, у іржавай савецкай касцы, напоўненай прыдняпроўскім пяском, запальваюць свечкі, і кожны з пошукавага атрада просіць пра спачын душ загінуўшых. А ўрачыстае пахаванне абаронцаў гэтых земляў прайшло ў другі фестывальны дзень. Рэшткі 140 вайскоўцаў пасля адпявання ў храме і развітальных словаў сваякоў і прадстаўнікоў улады былі зноў аддадзены зямлі.



Сяргей Чучвага, Мікалай Куцко, Аляксей Астроўскі, Алег Іваноў

А ў гэты час на беразе ракі ўжо вяліся падрыхтоўчыя работы піратэхнікамі і рэжысёрам рэканструкцыі баёў на Салаўёвай пераправе. Удзельнікі клуба «Памяць» не першы раз змагаліся з «немцамі» і ўтрымлівалі лінію атакі.

– Рэканструкцыя для нас – гэта не толькі магчымаць узяць у рукі зброю ды пераапрануцца ў рарытэтную форму, галоўнае для мяне, як выкладчыка, – гэта заахвочванне да гэтай справы моладзі, каб у яе прачнулася цікавасць да лёсу сваіх прадзедаў і нашай краіны, – расказвае кіраўнік клуба Сяргей Чучвага. – Салаўёва пераправа займае ў нашым маршруце асаблівае месца. Мы раніцай перапахавалі салдат, якія загінулі на гэтым жа месцы і бліжэйшым наваколлі каля пераправы. І ўзнаўляючы той апошні для іх бой, да мурашак па целе адчуваеш іх побач, і, калі па сцэнарыі ты загінуў, і неабходна ляжаць «памерлым» да канца рэканструкцыі, разумееш, што ў той час мог застацца тут назаўсёды.

Да беларусаў на форуме ставяцца вельмі зычліва і з асаблівай увагай. Пацверджанні гэтым словам відавочныя. Пасля рэканструцыі ў наш лагер завіталі... губернатар Смаленскай вобласці Аляксей Астроўскі, глава муніцыпальнай адміністрацыі Кардымаўскага раёна Алег Іваноў, кіраўнік аддзялення Пасольства Рэспублікі Беларусь у Смаленску Мікалай Куцко і прадстаўнікі іншых дзяржаўных структур Расіі. Гамяльчане адказалі на усе пытанні і пачаставалі губернатара гарбатай з сапраўднай салдацкай алюмініевай конаўкі часоў Айчыннай вайны. Мікалай Куцко ў сваю чаргу асабіста запрасіў беларусаў на наступны фестываль.

А зараз – інтрыга ўсёй нашай паездкі. У клуба ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Памяць» з'явіўся новы персанаж – ваенны журналіст у званні лейтэнанта. Так, у гэты раз я не толькі збірала інфармацыю для рэпартажа, а на сабе адчула жахі вайны і веліч подзвігу простага чалавека. Калегі-рэканструктары ацанілі «навінку» гамяльчан. Гэтыя людзі падтрымлівалі ў баі салдат у час вайны, а ў складаных становішчах самі браліся за зброю, а потым распавядалі народу і Радзіме пра сваіх герояў.

Трапіць у мінулае і вярнуцца назад – дзіўнае і незабыўнае адчуванне. Гэта мацней за ўсялякія заклікі і лозунгі, што прызываюць цаніць жыццё і мір. Дзякуй за гэтую магчымасць нашым сябрам са Смаленшчыны.

**Яніна ШАПАВАЛ, кіраўнік клуба маладых журналістаў «Жавяда» пры Гомельскім гарадскім камітэце БРСМ.**



МОЛОДЁЖЬ

# Общение без границ

**Более 120 молодых общественных лидеров, блоггеров, журналистов из государств-участников СНГ, Грузии и Южной Осетии объединил международный лагерь «Дни молодёжи содружества». На протяжении шести дней ребята общались, знакомились с традициями стран-соседей, участвовали в образовательных интерактивах и спортивных состязаниях. Как проходил межкультурный диалог молодёжи, рассказал студент ГГУ имени Ф. Скорины Алексей Шишикин, представивший на форуме Гомельскую область.**

– Международный лагерь основной своей задачей определил обмен опытом молодёжи разных стран, – делится Алексей. – Мероприятие проводится не первый год, среди его организаторов Совет по делам молодёжи государств-участников СНГ и Межгосударственный фонд гуманитарного сотрудничества государств-участников Содружества. На торжественном открытии, которое состоялось в Москве, была отличная возможность пообщаться с представителями организаторов фестиваля напрямую. Обсуждали создание интернет-портала СНГ для молодёжи, развитие молодёжного туризма. Затем все участники отправились в Калужскую область в культурно-образовательный центр «Этномир», где их ждала творческая и напряжённая работа в составе команд-содружеств. Несколько дней я провёл бок о бок с представителями других культур, узнал много интересной и полезной информации.

Ключевым событием лагеря стала конференция Международной молодежной общественной организации «Содружество», на которой обсуждалось создание национальных отделений организации во всех странах СНГ. Подобные организации помогают молодым людям постсоветских стран поддерживать и развивать дружеские отношения, совместно организовывать различные проекты, принимать участие в фестивалях, конкурсах. Здорово, что молодёжные инициативы находят отклик на международном уровне, это помогает развиваться и постоянно двигаться вперёд.

**Катерина ТОРИКОВА, «ГВ».**

СПАРТАКИАДА

# Жаркий спорт

**Летний этап круглогодичной спартакиады среди руководителей предприятий и организаций Советского района Гомеля прошёл в санатории «Золотые пески».**

25 команд состязались в разных видах спорта, показав свою силу, прыгучесть и скорость. Участники старались выложиться по максимуму, несмотря на стоящую в тот день тридцатиградусную жару. Команда Гомельского вагоностроительного завода во главе с директором Игорем Красновым на спартакиаду приехала только побеждать. В турнире по волейболу им досталось заслуженное «золото». Второе место у МПУ «Гомельмежрайгаз», третье – у филиала РУП «Гомельэнерго» Гомельские электрические сети. В соревнованиях по настольному теннису вновь равных не было Игорю Краснову, у него – первое место. «Серебро» в этом виде получил директор КАУП «ГорСАП» Александр Сиваков, «бронза» – у генерального директора ОАО «Гомельоблавтотранс» Дмитрия Старостенко. Лучшим из лучших в «борьбе» с 16-килограммовой гирей оказался заместитель директора ОАО «Гомельская мебельная фабрика "Прогресс"» Сергей Юзвяк. Он поднял чугунный снаряд больше всех – 126 раз. А вот соревнования по прыжкам не прошли так гладко: из-за «мокрых» капризов природы участникам пришлось переместиться с открытой площадки в спортзал. Самыми прыгучими оказались начальник отдела ЗАО «Гомельский вагоностроительный завод» Светлана Батурина и заместитель директора РУП «Гомельэнерго» Гомельская ТЭЦ-2 Михаил Починок.



На волейбольной площадке команда администрации Советского района

В тот же день прошло и награждение победителей и призёров летней спартакиады. На первом месте в общем зачёте предсказуемо оказалась команда вагоностроительного завода. На одну строчку ниже в турнирной таблице расположилась спортивная дружина мебельной фабрики «Прогресс». Сразу за ней с «бронзовым» результатом – команда «Гомельоблавтотранса».

**Светлана ИВАНОВА, «ГВ».**